ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ

# «Пясочнае – мой лёс, Пясочнае – мая радзіма»




**Аўтары:** удзельнікі аб’яднання па інтарэсах “Літаратурнае краязнаўства” ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”

**Кіраўнік –** педагог дадатковай адукацыі Майсюк Алена Уладзіміраўна

**Мэта экскурсіі:** азнаямленне з багатым мінулым аграгарадка Пясочнае (Капыльскі раён, Мінская вобласць), са старонкамі жыцця і творчасці яго славутых ураджэнцаў; далучэнне дзяцей і моладзі, а таксама ўсіх зацікаўленых асоб у працэс вывучэння гісторыі і культуры малой радзімы.

**Задачы:**

- Пазнаёміць з гісторыяй аграгарадка Пясочнае, з сістэмай яго гісторыка-культурных аб’ектаў.
- Развіваць цікавасць навучэнцаў да краязнаўства і спрыяць далучэнню да навукова-даследчай і пошукавай працы.
- развіваць экскурсійна-турыстычную дзейнасць ва ўстанове адукацыі праз выкарыстанне новых форм (віктарына, квэст-гульня);

- Спрыяць станаўленню вучнёўскага самаўпраўлення і фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

**Тып экскурсіі:** абзорная, загарадная, комплексная

**Від экскурсіі:** пешаходная.

**Формы правядзення:** экскурсія-прагулка, экскурсія-лекцыя, віктарына-крыжаванка, квэст-гульня.

**Часавая даўжыня** – 2 гадзіны, 20 мінут.

**Працягласць маршрута -** 3 км 70 м.

**Маршрут экскурсіі:** месца сустрэчы з групай – Мінская вобласць, Капыльскі раён, аг. Пясочнае, вул. Леніна, 10.

ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі" - "Мост праз раку Нёман – Радавое памесце Наркевічаў-Ёдкаў – Таполя, пасаджаная ў гонар вучонага С. А. Умрэйкі – Воінскае пахаванне і помнік "Смуткуючая маці" – Мемарыяльная дошка на месцы масавага растрэлу членаў партызанскіх сем'яў – Краязнаўчы музей установы адукацыі – Музейны пакой Адама Русака, "Беларуская хатка" ДУК "Песачанскі дом культуры і дасугу" – Храм Пакроваў Прасвятой Багародзіцы – ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі".

**Апісанне тэрыторыі**. Тэрыторыя экскурсіі знаходзіцца ў сельскай мясцовасці – аг. Пясочнае Капыльскага раёна, Мінскай вобласці і в. Наднёман Уздзенскага раёна. Маршрут прайшоў вывучэнне і апрабацыю. Маршрут бяспечны пры ўмове ведання і выканання правілаў бяспечных паводзін пешаходаў.

**Змест экскурсіі:**

Пясочнае займае ў гісторыі Капыльшчыны адметнае месца.На пачатку XX стагоддзя гэта было вялікае мястэчка, тут пражывала больш за 2000 жыхароў. Гістарычных падзеі пакінулі на тэрыторыі Пясочнага значныя адмецiны. У гады Вялікай Айчыннай вайны Пясочнае называлі партызанскай Масквой. Пясочнае – малая радзіма вядомых паэтаў-песеннікаў Адама Русака і Анатоля Астрэйкі. Ва ўстанове адукацыі "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі" вядзецца змястоўная краязнаўчая работа і на аснове пошукава-даследчай дзейнасці краязнаўцаў і распрацаваны дадзены маршрут экскурсіі – "Пясочнае – мой лёс, Пясочнае – мая радзіма"

Падчас экскурсіі наведвальнікі не толькі знаёмяцца з гістарычнымі фактамі, але і бачаць, як захоўваецца гістарычная спадчына малой радзімы, маюць магчымасць у займальнай форме (крыжаванка, квэст-гульня) праверыць і замацаваць свае веды.

**Практычнае значэнне:**

дадзены матэрыял не толькі экскурсійны, але і навучальны, і займальны,  і выхаваўчы.

Выкарыстоўваецца не толькі на ўроках, але і для правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў.

**Агульныя метадычныя ўказанні па тэме экскурсіі :**

- музейна-педагагічная падрыхтаванасць экскурсаводаў;

- гістарычна- краязнаўчая падрыхтаванасць экскурсаводаў.

**Агульныя арганізацыйныя указанні:**

- інструктаж па правілам бяспечных паводзін падчас экскурсійнага маршрута;

- безумоўнае выкананне правіл бяспечных паводзін падчас маршрута ўсімі ўдзельнікамі.

**Уступ да экскурсіі:**

знаёмства з групай, паведамленне аб тэме, мэце экскурсіі, віктарына-крыжаванка, паведамленне аб ходу экскурсіі, праверка ведаў правіл бяспекі пешаходаў; працягласць – 8 мінут.

**Заключэнне:**

адказы на пытанні ўдзельнікаў, запіс у кнізе водгукаў аб уражаннях, заўвагах і прапановах; працягласць – 5 мінут.

# Тэхналагічная карта маршрута экскурсіі

# “Пясочнае – мой лёс, Пясочнае – мая радзіма”

| Маршрут | Месца прыпынку | Аб’ект паказу | Працягласць паказу | Найменне падтэмы і асноўныя пытанні | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Уступ | | | | | | |
| аг. Пясочнае, ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі” | Фае ўстановы адукацыі | Установа адукацыі аг. Пясочнае. Віктарына-крыжаванка | 8 хвілін | “Уводзіны”<br><br>Знаёмства з групай, паведамленне аб тэме, мэце экскурсіі, віктарына-крыжаванка, “Падарожжа па Капыльшчыне”, прадстаўленне ўстановы адукацыі аг. Пясочнае | Знаёмства з правіламі паводзін падчас экскурсіі, з парадкам руху, праверка ведаў правіл бяспекі пешаходаў. | Прапанова групе стаць паўкругам не больш чым у два рады. Прапанова падчас віктарыны-крыжаванкі звяртаць увагу на падказкі ў выглядзе ілюстрацый. |
| Пераход да ракі Нёман (5 мінут) 100 м | | | | | | |
| Рака Нёман | Мост праз раку Нёман | Нёман і ваколіцы Пясочнага | 5 мінут | “Бераг майго роду”<br><br>Гістарычная даведка пра заснаванне мястэчка Пясочнае. Легенда пра Нёман | Група рухаецца за экскурсаводамі у парах, удзельнікі знаходзяцца ля парэнчаў моста, за агароджай ад машын. | Спачатку група аглядае краявіды, а пасля перамяшчаецца да наступнага аб’екта, пры гэтым адзін экскурсавод праводзіць экскурсію- |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | лекцыю, а другі расказвае паэтычную легенду пра Нёман. |
| Пераход (15 мінут) 1 км | | | | | | |
| В. Наднёман Узденскага раёна | Радавое памесце Наркевічаў-Ёдкаў | Уваходная брама, канюшня,карэтная, аўчарня, падвал для захавання кумысу, рэшткі вежы, дзе Я. Наркевіч-Ёдка праводзіў навуковыя доследы. | 20 мінут | “Старадаўні род Ёдкаў”<br><br>Памесце Ёдкаў. Прафесар электраграфіі і магнетызму, піяніст Якуб Наркевіч-Ёдка | Група знаёміцца з архітэктурным ансамблем радавога памесця Ёдкаў, з рэдкімі пародамі дрэў, што былі пасаджаны гаспадарамі маёнтка | У памесці праводзіцца рэканструкцыя, таму кіраўнік экскурсіі павінен загадзя дамовіцца аб наведванні дадзенага гістарычнага аб’екта.<br>Пры аглядзе рэштках вежы і будынкаў захоўваць павышаныя меры асцярогі, не падыходзіць бліжэй за 7 м. |
| Пераход (20 мінут) 1, 2 км | | | | | | |
| Аг. Пясочнае | Вул Леніна, 8 | Таполя, пасаджаная ў гонар вучонага С. А. Умрэйкі | 5 мін | “Таполя Умрэйкі”<br><br>С. А. Умрэйка – савецкі вучоны, педагог, грамадзянін”.<br>Яго імя носіць Песачанская ўстанова адукацыі. | Група, якая становіцца паўкругам, знаёміцца са старонкамі біяграфіі і асобай аднаго з арганізатараў | Выкарыстоўваюцца прыемы паказу і апаведу. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | народнай асветы ў БССР, аднаго з самых паважаных людзей у Пясочным. | |
| Пераход (3 мінуты) 50 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае | Плошча з правага боку Песачанскага цэнтра культуры і дасугу (вул. Леніна, 11) | Воінскае пахаванне, мемарыяльная дошка, помнік “Смуткуючая маці” | 7 мін | “Пясочнае – партызанская Масква”<br><br>Брацкія магілы.<br>Мемарыяльная дошка<br>Мітынг у Дзень Перамогі<br>Кніга А. Я. Умрэйкі “Записки о родине” | Група распалагаецца перад тэрыторыяй вайсковага пахавання, пасля аповеду экскурсавода – на тэрыторыі. | Аповед. Агляд. Хвіліна маўчання. |
| Пераход (3 мінуты) 20 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае | Плошча перад Песачанскім цэнтрам культуры і дасугу (вул. Леніна, 11) | Мемарыяльная дошка на месцы масавага растрэлу членаў партызанскіх сем’яў | 4 мінуты | “Гэта было 5 студзеня 1943 года…”<br><br>У той дзень фашысты зверскі расправіліся з партызанскімі сям’ямі – загінулі 30 дарослых і 13 дзяцей. | Група распалагаецца паўкругам перад Мемарыяльнай дошкай. | Аповед. Агляд. Хвіліна маўчання. |
| Пераход (4 мінуты) 100 м | | | | | | |
| Адпачынак. Арганізацыя чайнай паўзы. Праслухванне аўдыёзапісаў песень Адама Русака (15 мінут) | | | | | | |
| Аг. Пясочнае 2-і паверх ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс | Краязнаўчы музей установы адукацыі | Экспазіцыя, прысвечаная паэту-песенніку Адаму Русаку | 10 мінут | “Паэт-песеннік і музыкант Адам Русак”<br><br>Скрыпка паэта.<br>“Бывайце здаровы” – песня-візітоўка | Група распалагаецца паўкругам ля экспазіцыі, прысвечанай Адаму Русаку, | Выкарыстоўваюцца прыемы паказу і апаведу.<br><br>Экскурсія праводзіцца з |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі". | | | | Беларусі | пасля пераходзіць у вучэбны клас, дзе садзіцца для прагляду відэаматэрыялаў | комплексам відэазапісаў. |
| Аг. Пясочнае 2-і паверх ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі". | Краязнаўчы музей установы адукацыі | Экспазіцыя, прысвечаная паэту-песенніку Анатолю Астрэйку | 5 мінут | "Анатоль Астрэйка – беларускі Есенін"<br><br>"Слуцкі пояс"- кніжка-партызанка.<br>Газета-плакат "Раздавім фашысцкую гадзіну"<br>"Песня пра Нёман" | Група распалагаецца паўкругам ля экспазіцыі, прысвечанай Анатолю Астрэйку | Выкарыстоўваюц ца прыемы паказу і апаведу. |
| Квэст-гульня "Голас анёла" (10 мінут) | | | | | | |
| Пераход (5 мінут) 100 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае ДУК "Песачанскі цэнтр культуры і дасугу" | II паверх установы культуры. Музейны пакой Адама Русака. | Прадметы быта, музычныя інструменты, асабістыя рэчы, рукапісы Адама Русака | 5 мінут | "Музейны пакой Адама Русака" | Адвольнае месцазнаходжан не ўдзельнікаў. | Самастойны агляд экспанатаў |
| Аг. Пясочнае ДУК "Песачанскі цэнтр культуры і дасугу" | II паверх установы культуры. Музейны пакой "Беларуская хатка" | Прабметы быта і народнай культуры, мастацкія вырабы мясцовых майстроў | 5 мінут | "Беларуская хатка" | Агляд падчас аповеду. | Экскурсію праводзяць супрацоўнікі ўстановы культуры |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пераход (10 мінут) 200 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае Храм Пакроваў Прасвятой Багародзіцы. | Храм Пакроваў Прасвятой Багародзіцы. | Гісторыя, архітэктура і ўнутранае ўбранства храма | 5 мінут | “Духоўнае жыццё аграгарадка Пясочнае”<br><br>Дзмітрыеўская царква. Пакроўская царква. Святары-пакутнікі Пясочнага, ахвяры рэпрэсій 30-х гадоў. Храм Пакроваў Прасвятой Багародзіцы. | Знаёмства з правіламі паводзін пры наведванні праваслаўнага храма, выкананне патрабаванняў да знешняга выгляду, галаўных убораў наведвальнікаў. Звярнуць увагу на захаванне цішыні. | Пажадана папярэдне дамовіцца аб правядзенні экскурсіі з настаяцелем прыходу, іерэем Віталіем Станкевічам. |
| **Пераход** (15 хвілін) 300 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”. | Фае ўстановы адукацыі | - | 5 мінут | Заключэнне. | Падвядзенне вынікаў экскурсіі, адказ на пытанні ўдзельнікаў. Прапанова пакінуць свій водзыў. Падзяка за ўвагу. | Распалажыць групу паўкругам.<br><br>Прапанаваць Кнігу водзываў для жадаючых пакінуць запіс аб сваіх уражаннях. |



Фота 1. Аг. Пясочнае. ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”.




Фота 2. Крыжаванка “Падарожжа па Капыльшчыне”



Фота 3. Рака Нёман



Фота 4. Брама радавога памесця Наркевічаў-Ёдкаў.



Фота 5. Таполя, пасаджаная школьнікамі

ў гонар вучонага С. А. Умрэйкі



Фота 6. Вайсковае пахаванне і помнік “Смуткуючая маці”




Фота 7. Краязнаўчы музей ўстановы адукацыі.

Ля экспазіцыі, прысвечанай Адаму Русаку




Фота 8. Краязнаўчы музей ўстановы адукацыі.

Экспазіцыя, прысвечаная Анатолю Астрэйку.






Фота 8-9. Квэст-гульня “Голас анёла”



Фота 10. ДУК “Песачанскі дом культуры і дасугу”



Фота 11. “Беларуская хатка”







Фота 12-13. Храм Пакроваў Прасвятой Багародзіцы